*Д. А. Доўгаль* (Магілёў, Беларусь)

# РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ЗАСВАЕННІ КУРСА "МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ"

Асноўнай мэтай навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца авалоданне вучнямі функцыянальнымі сродкамі мовы для іх эфектыўнага выкарыстання ў розных сітуацыях маўленчых зносін. Для таго, каб рэалізаваць такім чынам акрэсленую мэту, неабходна, каб настаўнікі не толькі валодалі метадычнымі кампетэнцыямі, але і ўмела карысталіся мовай у зносінах. Менавіта таму развіццё маўлення і мыслення студэнтаў з'яўляецца адной з актуальных праблем сістэмы прафесійнай адукацыі.

Пад развіццём маўлення традыцыйна разумеюць педагагічную дзейнасць, скіраваную на авалодванне вучнем, студэнтам (ці – шырэй – чалавекам) сродкамі вуснага і пісьмовага маўлення ў мэтах камунікацыі і слоўнай творчасці. Арганізацыя гэтай дзейнасці ў межах дысцыпліны "Методы-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання" (МВБМіЛЧ) сутыкаецца з шэрагам цяжкасцей. Аб'ектыўнай прычынай слабага ведання сённяшнімі студэнтамі беларускай мовы з'яўляецца сітуацыя асіметрычнага білінгвізму ў нашай краіне, якая не заахвочвае настаўнікаў (а значыць, і іх вучняў) да выкарыстання мовы ў камунікацыі. Разам з тым, вырашэнню гэтай задачы на І ступені вышэйшай адукацыі замінае адсутнасць комплекснага падыходу да пытання развіцця маўлення студэнтаў. Вучэбныя планы спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" не змяшчаюць дысцыплін, скіраваных на развіццё прафесійных маўленчых навыкаў. Прызнаем таксама, што перавагу ў метадычным арсенале выкладчыкаў ВНУ маюць традыцыйныя формы арганізацыі вучэбнай дзейнасці. А рэальная педагагічная практыка патрабуе ад студэнтаў змены відаў маўленчай дзейнасці з пасіўных (аўдзіраванне і чытанне), да якіх яны прывыклі на лекцыях і пры падрыхтоўцы да практычных заняткаў, на актыўныя (гаварэнне і пісьмо), а таксама пераходу ад практыкаванняў рэцэптыўнага і рэпрадуктыўнага тыпаў да прадуктыўных – даследчых і творчых.

Таму кожны выкладчык дысцыплін метадычнага цыкла ў межах свайго прадмета імкнецца такім чынам арганізаваць вучэбную дзейнасць, каб сфарміраваць неабходныя маўленчыя ўменні і навыкі. Змест працы па развіцці маўлення ў межах МВБМіЛЧ бачыцца нам у арганізацыі дзейнасці па авалодванні студэнтамі камунікатыўнымі навыкамі, неабходнымі для ажыццяўлення ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці па выкладанні дысцыплін "Беларуская мова" і "Літаратурнае чытанне" на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У аснову развіцця маўлення намі кладзецца камунікатыўны кірунак, паколькі менавіта фарміраванне камунікатыўных уменняў уключае ў сябе іншыя напрамкі развіцця маўлення: развіццё звязнага маўлення, фарміраванне сінтаксічнага ладу маўлення, развіццё актыўнага слоўнікавага запасу. Камунікатыўныя навыкі фарміруюцца ў спецыяльна арганізаваных сітуацыях, якія прадугледжваюць неабходнасць выкарыстання мовы ў зносінах. На нашу думку, асноўнай сітуацыйнай формай, якая патрабуе ад настаўніка прымянення маўленчых навыкаў, з'яўляецца ўрок. Нягледзячы на цэласны характар, абумоўлены тэматычнай вызначанасцю і адзінствам мэтавых установак, кожны ўрок складаецца з асобных этапаў, якія прадугледжваюць выкарыстанне стандартызаваных маўленчых форм. Пры ўсёй разнастайнасці зместу заняткаў дзейнасць настаўніка на ўроку зводзіцца да выкарыстання пэўных метадаў (сярод найбольш распаўсюджаных у педагагічнай практыцы гутарка, слова настаўніка, работа з падручнікам, практыкаванне), якія маюць адпаведныя граматычныя і лексічныя сродкі ўвасаблення. Так, гутарка прадугледжвае пытальна-адказавую форму ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў, значыць, педагог павінен



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

валодаць рознымі сродкамі граматычнага афармлення пытальных сказаў, "рэактыўнай" лексікай (словамі, якія выкарыстоўваюцца ў адказ на меркаванне вучня) і да т.п. Для авалодвання гэтымі маўленчымі формамі мы лічым мэтазгодным арганізацыю працы па модулях, якія адпавядаюць асобным тэмам курса методыкі і маюць у якасці выніковага задання падрыхтоўку сцэнарыя фрагмента (у вуснай форме) і канспекта або тэхналагічнай карты ўрока (у пісьмовай). Пры планаванні дзейнасці па развіцці маўлення неабходна таксама памятаць, што праграма засваення кожнай дысцыпліны прадугледжвае як аўдыторныя заняткі (у курсе МВБМіЛЧ для студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі гэта лекцыі, семінарскія і лабараторныя заняткі), так і арганізаваную самастойную працу па прадмеце. Праілюструем гэта на прыкладзе вывучэння тэмы "Навучанне пісьму".

| Вучэбная форма рэалізацыі | Змест матэрыялу | Характар практыкаванняў па р/м | Самастойная работа студэнтаў |
|---|---|---|---|
| Лекцыя | Тэарэтычныя пытанні падрыхтоўкі вучняў да пісьма і выпрацоўкі пачатковых графічных навыкаў | Рэцэптыўныя (праслухоўванне лекцыі, запіс вызначэнняў і пад.) | Канспектаванне артыкула З. Тамашэвіч "Тэарэтычныя асновы фарміравання каліграфічнага навыку пісьма" |
| Семінарскія заняткі | Структура ўрока пісьма ў перыяд навучання грамаце | Рэпрадуктыўныя (прайграванне сцэнарыя ўрока пісьма з прапанаванага ўзору) | Пераклад матэрыялаў з "Дэманстрацыйнага набору пісьмовых літар" (склад. В. Цырынава) |
| Лабараторныя заняткі | Правядзенне ўрока пісьма малога / вялікага варыянту пісьмовай літары | Прадуктыўныя (правядзенне фрагмента заняткаў (вусна)) | Распрацоўка пісьмовага канспекта ўрока "Пісьмо літары…". |

Арганізаваная такім чынам праца дазваляе пераходзіць ад пасіўных форм маўлення да актыўных, ад рэцэптыўных практыкаванняў праз рэпрадуктыўныя да прадуктыўных у межах адной тэмы. Гэты падыход мае шэраг дадатных момантаў:

– маўленчую практыку атрымліваюць усе студэнты;

– развіццё маўлення мае дзейнасны характар: авалодванне маўленчымі нормамі вядзецца на аснове выканання практыка-арыентаваных заданняў;

– авалодванне тэарэтычнымі ведамі спалучана з выпрацоўкай навыкаў, у тым ліку маўленчых.

Калі ў межах кожнай тэмы развіццё маўлення вядзецца ад рэцэптыўных практыкаванняў да рэпрадуктыўных і прадуктыўных, то ў межах усяго курса МВБМіЛЧ (ён разлічаны на 2 семестры) назіраецца паступовае павелічэнне прадуктыўных работ творчага характару, сярод якіх назавём:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– рэфлексійнае сачыненне “Як я правёў методыку беларускай мовы ў I семестры”,

– творчыя работы ў межах вывучэння тэмы “Развіццё маўлення вучняў” (сачыненні па серыі малюнкаў і інш.),

– складанне сцэнарыяў пазакласных мерапрыемстваў па беларускай мове,

– падрыхтоўку маналагічных выказванняў “Для чаго трэба вывучаць беларускую мову” з улікам адрасатаў паведамлення (вучні або іх бацькі) і г.д.

Па нашых назіраннях, асаблівых поспехаў у развіцці маўлення дасягаюць тыя педагогі, якія прытрымліваюцца пераканання: “Калі я хачу, каб мае вучні паспяхова авалодвалі навыкамі маўлення па-беларуску, я мушу дэманстраваць гэтыя навыкі сам”. Таму адной з асноўных задач курса мы лічым заахвочванне да выкарыстання беларускай мовы на занятках і па-за імі. У студэнцкай аўдыторыі вырашэнне гэтага пытання ажыццяўляецца праз установку на поўнае пагружэнне (для студэнтаў, якія валодаюць пэўнай граматычнай і лексічнай базай, але маюць праблемы з ужываннем мовы ў зносінах, такі метад з’яўляецца карысным), пашырэнне адукацыйнай прасторы за кошт – выкарыстаем школьны тэрмін – пазакласнай работы (музейныя экскурсіі, творчыя сустрэчы, метадычныя алімпіяды, выхаваўчыя мерапрыемствы на факультэце і г.д.). Адзінства вучэбнай і выхаваўчай работы па дысцыпліне “Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання” садзейнічае вырашэнню задачы развіцця маўлення будучых педагогаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова